Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 1 Вільня, Серада 30-га сакавіка 1927 г. Год I

Ад Рэдакцыі.

У трудную часіну выпускаем мы першы нумар нашае часопісі.

У сувязі з рэпрэсіямі проці „Грамады“ і ўсяго таго, што так ці сяк зьвязана з дзеяльнасьцяй зьліквідаванае ўрадам арганізацыі беларускіх сялян і работнікаў, — з аднаго боку, ды з выразным паваротам нацыяналістычных беларускіх груп у кірунку да паразуменьня з польскай буржуазіяй, — з другога боку, — выявілася нястача ў нашым грамадзянстве такога органу, які, ня зьвязаны тэй ці іншай партыйнасьцяй, даваў-бы асьвятленьне бягучага жыцьця **выключна з пункту гледжаньня інтарэсаў беларускіх працоўных масаў**. Каб запоўніць гэтую нястачу, мы і прыступаем да выдаваньня нашае часопісі.

Каля нашага органу гуртуюцца прадстаўнікі запраўды-ж незалежнае беларускае грамадзкае думкі. Мы зьвязаліся ня толькі з **віленскімі дзеячамі,** але такжа і **з правінцыяй** і — што асабліва важна — з нашай **амэрыканскай эміграцыяй**. Мы рашуча адкідаем усе модныя „арыентацыі“ на таго або іншага суседа і арыентуемся толькі на наш **беларускі працоўны народ,** бачучы толькі ў масе крыніцу ўсякае творчае сілы і веручы крэпка, што толькі сама маса можа выкаваць сабе падставы новага вольнага жыцьця.

Але зусюль робяцца спробы супыніць магутны ўзрост актыўнасьці беларускіх працоўных масаў, які так ярка выявіўся за апошнія часы. Робяць гэта і „свае“, якія хацелі-бы, каб маса лепш спала, ды аддалася-бы цалком пад іхнюю „апеку“, — і чужыя, якія не перасталі ўглядацца на Беларусь — ці то як на расейскія „акраіны“, ці як на польскія „крэсы“, ці ўрэшце, як на „абмаскоўленую літоўскую зямлю“, якая мусіць быць „вернена“ Літве дзеля „павароту“ беларускага насяленьня краю да „сваей“ літоўскай нацыянальнасьці... Вось, чаму занятае намі **незалежнае становішча** пэўне-ж будзе шмат каму не да смаку, і мы наперад мусім быць прыгатаваны да ўсялякіх **udaраў і рэпрэсіяў**.

Аднак, **гэта нас не палохае.** Мы прыступаем да працы затым, што лічым яе за свой сьвяты **абавязак**, і будзем працаваць датуль, дакуль хваце нам сілы. Мы будзем клікаць наш народ да **актыўнае працы, да самадзейнасьці ў-ва ўсіх галінах жыцьця**, пашыраючы ў масах сьвядомасьць неабходнасьці перадусім падняцьця іх **культурнага стану**, што зьяўляецца падставай усялякае грамадзкае працы наагул. А кожная здабыча на гэтым шляху будзе служыць для нас магутным падтрыманьнем у цяжкай барацьбе за сьвятыя ідэалы беларускіх сялян і работнікаў.

Перамога Кантонцаў.

Нанкін—ў руках кантонцаў!

Нанкін, вялікае места і вялізарнай важнасьці стратэгічны пункт на шляху паўночных арміяў, што ідудь на „вызваленьне“ Шанхаю,—ўзяты **з бою кантонскай арміяй**.

Шанхай таксама заняты!

У аўторак газэты падалі вестку, што Шанхай ужо здабыты кантонскай арміяй.

Камэндант шанхайскіх „белых“ войск уцёк на тэрыторыю француске канцэсіі.

Кантонцы ідуць далей на поўнач.

Кантонская армія, узяўшы Нанкін, ня спыніла свайго наступленьня на поўнач. Гарачыя баі ідуць пад м. Чу. Узьнімаецца пагроза і для сталіцы Кітаю—Пэкіну, дзе засеў Чанг-Тсо Лін.

Амэрыка шлець новыя войскі ў Кітай.

У часе ўзяцьця Нанкіна і Шанхаю паміж забітымі чужаземцамі акачалася значная лічба амэрыканцаў. Гэта выклікала вялікае абурэньне ў Амэрыцы, урад якое зараз-жа выслаў у Шанхай некалькі новых ваенных караблёў з войскам.

У „чужаземным Шанхаі“.

У Шанхаі пад уладай чужаземных войскаў асталіся толькі так-званыя „канцэсыйныя тэрыторыі“, гэта значыць—землі, на якіх чужаземцы пабудавалі свае дамы, фабрыкі і г. д., якія дагэтуль у Кітаі карысталіся правам непадлягаьня кітайскім уладам. З гэтых земляў пад Шанхаем, пераважна над морам, стварыўся з часам вялізарны „другі Шанхай“—чужаземны. У гэтым „чужаземным Шанхаі“, які яшчэ ня ўзяты кантонскай арміяй, жыве адных толькі кітайцаў, пераважна працоўнай беднаты, нялюдзка эксплёатаванай на фабрыках, — аж паўтара мільёна людзей. На ўсім гэтым вялізарным абшары абвешчана цяпер ваеннае палажэньне. Паўколам гэтае „чужаземнае“ места акружае кардон пераважна англійскіх войскаў.

Ясна, што надалей утрымаць у спакоі ды пакорнасьці армію працоўных — побач з другой паловай места, дзе пануе кантонскі ўрад, будзе немагчыма. І гэтая справа павінна будзе вырашыцца неўзабаве.

Надзеі Англіі на „раскол у Кантоне“.

Англія, заняўшы моцную, але каштоўную для яе скарбу „пазыцыю“ ў Шанхаі, рыхтуючыся да перагавораў з Кантонам, мае вялікія надзеі на тое, што ў лоне кантонскага ўраду зробіцца „раскол“—між „чырвонымі“—сацыяльнымі радыкаламі і „ўмеранымі“—нацыяналістамі. Быццам кіраўнік кантонскай дыпляматыі Чан-Кай-Чэк—праціўнік „чырвоных“, а перадусім — вораг маскоўскіх бальшавікоў. Быццам як Англія, таксама і Японія—праз „свайго“ Чанг-Тсо-Ліна — ставяць першым варункам распачацьця перагавораў выдаленьне маскоўскіх агентаў з Кантону. За гэта, як пішуць газэты, Англія прапануе кантонскаму ўраду вялізарную „пазыку“ (папросту—хабара!).

Ці пойдзе на гэта Кантон, няведама. Пакуль-што аб нейкім „расколе“ там яшчэ ня чуваць. Дый гэткую магчымасьць даўно прадбачыла радавая прэса. Бо яшчэ ў адным з лістападавых нумароў „Экономической Жизни“ кітайскі карэспандэнт гэтай газэты лічыў найбольш верыгодным якраз гэткі ход падзеяў: перамогу больш памяркоўных палітыкаў нацыяналістаў, прадстаўнікоў рознага роду дробна-буржуазных групаў, якія ў канцы выкарыстаюць перамогу працоўных масаў над чужаземцамі.

Агульныя вынікі перамогі кантонцаў.

За апошні тыдзень у Кітаі адбыліся здарэньні, значна зьмяніўшыя палажэньне ваюючых староnaў. Кантонская армія мела пасьпехі вялізарнага стратэгічнага і маральнага значэньня, якія адаб'юцца далёка па-за межамі Кітаю. Без спраціўленьня—амаль ня выключна ў выніку ўнутранага выбуху — паўстаньня народных масаў—заняты Шанхай і Нанкін, два найвялікшыя і найважнейшыя месты ў Кітаі, асабліва важныя для чужынцаў. Гэтым уласьціва кажучы, чыста ваенная акцыя вызваленьня ад чужынцаў паўдзённага Кітаю можа лічыцца ў галоўным споўненай. Абедьве староны захапілі апошнія пазіцыі, якіх адна адну ня могуць пазбавіць сілай: ані чужаземцы ня могуць узяць Шанхай сілай, ані кантонцы—выгнаць чужаземныя браняносцы з шанхайскага порту. Але за тое—як Шанхайскі порт зусім не патрэбны для чужаземцаў без кітайскага „гінтэрлянду“ (абшару ў глыб краю), таксама і для кантонцаў зачынены на замок чужаземным флётам шанхайскі порт мала можа даць. Трэба думаць, што ў такіх абставінах—побач з ідучай усьцяж па інэрцыі „пазыцыйнай вайне“—пачнецца пэрыяд рашучых перагавораў аб „міры“.

У свой час наша прэса адзначала Ханькоўскі дагавор, як „прыкладны“, паводле якога пасьля будуць апрацаваны акачальныя ўмовы з чужаземцамі. Падставай умовы было прызнаньне бязумоўнай і неабмяжованай сувэрэннай улады кітайскага ўраду і кітайскіх законаў на кітайскай зямлі, з чаго вынлывалі і бязумоўныя абавязкі гэтай улады бараніць чужаземцаў і іх маемасьці і адказываць за нятыкальнасьць тых і другіх. Кітай меў атрымаць фактычна ўсе правы роўнасьці з іншымі незалежнымі дзяржавамі.

Гэта ёсьць першая і галоўная перамога Кантону, якую астаецца толькі—запісаць на папэры, юрыдычна фармулаваць у дагаворах.

Што датычыць адносінаў паміж Паўднём і Паўночай, дык трудна думаць, што Чанг-Тсо Лін запраўды маніцца „зьнішта-жаць бальшавіцкі кантонскі ўрад“, выцягваючы з гарачага прыску пячоную бульбу для англійцаў, рызыкуючы абпаліць сабе да локця рукі. Чанг здаволіцца тым, што зьнішто-жыў—у барацьбе з „чырвонымі“—усіх драбнейшых валадароў Сярэдняга Кітаю, навет тых, што шчыра памагалі яму ў барацьбе — за англійскія ці японскія грошы. Цяпер ён, трэба думаць, будзе імкнуцца да паразуменьня з Кантонам — за ўсялякую цану, — каб толькі кантонская армія часам не пайшла залішне далёка на поўнач, узрываючы „дынамітам агітацыі“ пакорныя яму яшчэ арміі на фронце ды працоўныя масы ў тылох. Есьць чуткі, што гэтыя перагаворы ўжо ідуць. Ці выйдзе з іх нешта ў родзе „адзінай цэнтральнай улады аб'яднанага Кітаю“, пакуль-што трудна спадзявацца. У кожным разе разрыў гэтых перагавораў, здаецца, будзе азначаць, што кантонская армія, як больш актыўная, пастанавіла прадаўжаць так пасьпешна распачатае дзела вызваленьня і аб'яднаньня Кітаю ў адно адзінае цэлае. Але гэта ўжо яўна пагражае выклікаць з-за сьпіны Чанг Тсо Ліна схаванага там японскага жываеда. Ясна, што на шляху да поўнага нацыянальнага аб'яднаньня і незалежнасьці Кітайскаму народу прыдзецца перамагчы яшчэ шмат перашкодаў.

Абвяшчэньне Грамады нелегальна партыяй.

Такі-ж лёс спаткаў і Незал. Партыю Хлопскую.

Міністар унутраных спраў прызнаў Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду і Незалежную Партыю Хлопскую варожымі да польскае дзяржаўнасьці і істнуючага ў ей ладу і абвясьціў абедзьве арганізацыі забароненымі і нелегальнымі.

На гэтай падставе ваяводамі ваяводзтваў, якія ўваходзяць у склад Заходняе Беларусі, выданы адозвы да насяленьня гэтых ваяводзтваў — з заклікам да выхаду з Грамады і выдачы ўладам усіх актаў і друкаў партыйных, пячатак і г. д. Ваяводы перасьцерагаюць, што адгэтуль усе, хто будзе належаць далей да Грамады, ці прымаць учасьце ў дзеяльнасьці яе, як забароненай, будзе цягнены да судова-карнае адказнасьці з усей суровасьцяй закона.

Такія-ж адозвы апублікаваны і ў справе Нез. Парт. Хлопскай.

У Вільні зроблены вобыск і апячатана памяшчэньне Цэнтральнага Сэкрэтарыяту Грамады (Вялікая вул. 30, кв. 9). Тое-ж зроблена і з сэкрэтарыятам НПХ.

Адначасна паліцыя пазабірала ўсе матэрыялы і рэчы ў павятовых камітэтах Грамады, а памяшчэньні паапячатавала.

Адбываецца ліквідацыя гмінных гурткоў.

Галадоўка палітычн. вязьняў у Вронках.

Толькі цяпер з вастрогу ў Вронках дайшла вестка аб тым, што 2-га сакавіка тамака палітычныя вязьні распачалі галадоўку, якая 12-га сакавіка яшчэ трывала.

Як ведама, у Вронкі перавезены з Лукішскае турмы ў Вільні 10 палітычных вязьняў—беларусаў, у тым ліку і пяцера паслоў. Яны разьмешчаны ў Вронках у „адзіночках“ у асобным корпусе (жаноцкім). Ня гледзячы на гэта, калі да іх дайшла вестка аб галадоўцы палітычных, і яны ўсе далучыліся да яе, дадаючы да агульных дамаганьняў і свае спэцыяльнае: каб іх перавялі ў агульны будынак.

Галадаючыя дамагаюцца: адчыненьня на дзень камэраў і дапушчэньня свабодных зносінаў паміж вязьнямі, (у Вронках агульных камэраў няма, і ўсе сідзяць у „адзіночках“); дапушчэньня ўсіх газэт і кніжак, якія выходзяць легальна; права завясьці супольную касу палітычных і падзелу ахвяр з волі паміж усімі палітычнымі вязьнямі; паляпшэньня ежы; паляпшэньня лекарскае помачы і г. д.

Ад 12-га сакавіка ніякіх новых вестак аб галадоўцы не паступала, і вынікі яе—няведамы, хаця дагэтуль яна напэўна ўжо мусіла скончыцца.

У Сойме.

Зачыненьне звычайнай сэсіі Сойму.

25-га сакавіка віцэ прэм'ер Бартэль зьявіўся ў Сойм і прачытаў на паседжаньні дэкрэт п. Прэзыдэнта — аб зачыненьні звычайнай бюджэтнай сэсіі Сойму. Адначасна тое-ж самае зроблена і з Сэнатам. Дэкрэт падпісаны Прэзыдэнтам, зразумела-ж, па прапазыцыі і за адказнасьцю старшыні Рады Міністраў.

Як тлумачыў паслом старшыня Сойму, урад зачыніў Парлямант, каб — „аддзяліць выразна спэцыяльна бюджэтную сэсію яго ад іншай працы законадаўчых Палатаў“,—аб чым аднак жа неяк зусім нічога ня кажа Канстытуцыя, дадамо ад сябе. Але на вясну— у канцы красавіка ці ў пачатку траўня—мае быць склікана надзвычайная сэсія, якая мо' і дакончыць тую працу, што пачата ў гэтай сэсіі.

Вельмі цікаўна, што Сойм распушчаны на вакацыі—якраз перад трэцім чытаньнем законапраекту аб сабраньнях — звычайных і пасольскіх (справаздаўчых), якое мела закончыцца можа ў той самы дзень. Як ведама, урад заявіў, што ня прыме ўчасьця ў працы над гэтым праектам, бо... мае — замест соймавага закону—выдаць дэкрэт, рэгулюючы гэту справу.

Эндэцкі праект „процікамуністычнага“ закону.

Яшчэ толькі ў летку прошлага году эндэкі, як ведама, высоўвалі праект легалізацыі камуністычнай партыі, пазываючыся пры гэтым на прыклад усяе Эўропы,—а вось цяпер раптам апрацавалі праект закону аб „барацьбе з камунізмам“, які і падалі ў Сойм. 19 сакавіка канстытуцыйная камісія пачала разгляд гэтага „праекту“.

Праект разглядаецца ў „канстытуцыйнай“ камісіі мо' затым, што ён зьяўляецца яўным нарушэньнем Канстытуцыі, калі не казаць аб яго недарэчнасьці ды папросту невыканальнасьці. Бо ж, калі і цяпер у Польшчы, а перадусім „на крэсах“ пануе, як сказаў сам мін Мэйштовіч. — „атмосфэта шпеговска“, дык што было-б, калі-б увайшоў у жыцьцё закон, апрацаваны эндэцкімі мазгамі?

Паслухайце. Праект дамагаецца кары, як за „замах на дзяржаўны лад Польшчы“, для ўсіх тых асобаў, якія „**маюць зносіны** з арганізацыямі ды асобамі, што знаходзяцца заграніцай, — з мэтай падрыхтаваньня камуністычнай рэвалюцыі“... Далей праект трэбуе безадкладнага зачыненьня ўсялякіх арганізацыяў, партыяў і саюзаў, якія „імкнуцца да камуністычнае, рэвалюцыі“... Далей — праект пазбаўляе безадкладна мандатаў усіх выбраных у самаўрады сяброў — ня толькі тых, якія самі ўваходзяць у камуністычныя арганізацыі, але і тых, якія „астаюцца ў адносінах залежнасьці(?) ад гэтых арганізацыяў“... Пры гэтым „пазбаўленьне мандатаў“ выбраных народам самаўрадавых дзеячоў — „за адносіны залежнасьці“ —будзе рабіць навет ня суд, але — „надзорчыя ўлады“ ў самаўрадах, ці — паны старосты і ваяводы...

Але і на гэтым праект эндэцкага „дзяр-

жаўна-творчага" розуму ня спыніўся. Ен ідзе яшчэ шмат далей. — Ен дае права „выбарнай камісіі" ўневажняць усе тыя кандыдацкія сьпіскі па выбарам у Сойм, у Сэнат і ў самаўрады, якія ці яўна назавуць сябе камуністычнымі, ці „камунізуючымі" (паказываючы сувязь іх з камуністычнымі арганізацыямі'), ці — якіх „залежнасьць ад гэтых арганізацыяў будзе сьцьверджана тым ці іншым спосабам".

Праект яўна мае мэтай ратаваць эндэцыю ды родную ей рэакцыю — у часе набліжаючыхся выбараў. Каго можна наагул падцягнуць пад паняцьце „залежных ад камуністычных арганізацыяў", — аб гэтым ясна кажуць нашы віленскія публіцысты, як пан Обст і іншыя. Калі, напрыклад „камунізуючай" называе Грамаду кс. Станкевіч, дык пан Обст самога ксяндза лічыць і называе.. „бальшавіцкім агентам", значыць — „залежным ад камуністычных арганізацыяў" і „ўваходзячым у зносіны з асобамі і арганізацыямі, што знаходзяцца заграніцай,—у мэтах".. і гэтак далей...

Эндэцкі розум і апэтыты, аднак-жа нэ сустрэлі прызнаньня навет і ў Сойме. Адзін за адным сябры камісіі грамілі гэты праект. Ядавіта адзначалася, што эндэкі бароняць істнуючы ў Польшчы дзяржаўны лад чамусьці толькі ад небясьпекі зьлева, ня кажучы нічога аб арганізацыях фашыстаўскіх ды манархістычных, якія таксама рыхтуюцца да замаху... Казалі аб тым, што ўся „юрыдычная тэрміналёгія" праекту — папросту — нячувана дурная: як азначыць юрыдычна „імкненьне да камуністычнай рэвалюцыі", ці „залежнасьць ад камуністычных арганізацыяў"? Пэпэсы давалі прыклады, як на „крэсах" „інтэлігэнтная" адміністрацыя камуністамі лічыць усіх пэпэсаў, ня кажучы ўжо аб больш радыкальных работніцкіх і сялянскіх партыях. Навет „работнікі-нацыяналісты", родныя эндэкам, назвалі „праект" іх — „дурным".

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, прапазыцыя адкінуць цалком праект, як недарэчны, праваліліся. Праваліліся навет прапазыцыя хадэкаў, каб выбраць для пераробкі праекту спэцыяльную пад-камісію. Праект большасьцю галасоў прыняты за падставу адпаведнага закону і будзе далей разглядацца ў другім чытаньні.

Цікаўна, што прадстаўнік міністэрства справядлівасьці заявіў, што ўрад ня мае нічога сказаць аб гэтым праекце — ні за яго, ні проці, а толькі міністар просіць Сойм, каб не даручаў выкананьне гэтага закону яму, а — міністру ўнутраных спраў... Калі ўжо навет п. Мэйштовіч адкрыжоўваецца ад эндэцкага праекту, дык відаць — добры...

Законапраект аб сабраньнях — гатовы.

Канстытуцыйная камісія Сойму, пасьля, здаецца, 4-летняй працы, апрацавала нарэшце Закон аб Сабраньнях. Пачатны праект закону апрцаваны яшчэ ў часе слаўных хіена-пястоўскіх „жондаў" ў 1923 г. — паслом Лютаслаўскім. Праект тых часоў, праўда, значна папраўлены ў камісіі, але ж ведама, што да прадбачанай у Канстытуцыі „вольнасьці сабраньняў" яму таксама далёка, як курыцы да сакала. Законапраект кажа і аб пасольскіх справаздаўчых мітынгах, якім таксама ставіць пэўныя путы.

Ці дачакаецца гэты праект свайго ажыцяўленьня, сумляваецца навет яго абаронца ў камісіі пас. Чапінскі. Бо-ж запраўды няведама зусім, скольки часу дазволіць жыць Сойму ўрад і ці дасьць яму зрабіць штосьці апрача прыняцьця бюджэту... Толькі што аб гэтым рубам паставілі пытаньне старшыні Сойму некаторыя паслы. Той адказаў, што — „ня ведае"...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Пасьля лодзкае забастоўкі.

Усепольская забастоўка работнікаў валакністае прамысловасьці скончылася раптоўна, пратрываўшы каля тыдня.

Забастовачны рух, распачаты ў аднэй галіне прамысловасьці, — праўда, найбольш шматлюднай у Польшчы,—пачаў пашырацца і на іншыя.—Арганізацыі мэталістаў заявілі, што падтрымаюць сваіх таварышоў-ткачоў ды прадзільшчыкаў, і 17 сакавіка споўнілі сваё абяцаньне. У суботу 19 сакавіка мела распачацца ў Лодзі ўжо—агульная забастоўка работнікаў усіх галінаў і спэцыяльнасьцяў, не выключаючы працаўнікоў установаў агульнага ўжытку і першай патрэбы, — як мястовых вадаправодаў, электрыкі і інш. Адначасна з выбухам забастоўкі, як пісаў „Роботнік", распачаўся рух сярод чыгуншчыкаў.

18 сакавіка, пасьля няўдачы місіі мін. працы, урад на паседжаньні Рады Міністраў пастанавіў запрапанаваць абодвум лагерам свой „арбітраж", ці інакш сябе — у судзьдзі паміж работнікамі і прамыслоўцамі. Першым чынам павінна была быць разгледжана справа канфлікту ў прадзільна-ткацкай прамысловасьці.

Увечары 18-ж сакавіка ў Лодзі адбылося паседжаньне прадстаўнікоў Работніцкіх Прафэс. Саюзаў у Лодзі, на якім пастаноўлена было адмовіцца ад суду ўраду ў канфлікце...

19 сакавіка — пад уплывам пэпэсаўскіх павадыроў — выбух агульнае забастоўкі быў прыпынены. Адбылося новае паседжаньне Міжсаюзнай Камісіі ў справе прапанаванага ўрадам арбітражу. З 10 саюзаў прымалі ўчасьце ў паседжаньні 9; кожны меў па 2 галасы. Пасьля вельмі „апазіцыйных" прамоваў п. п. пэпэсаў — проці арбітражу, ды проці п. Бартля, які толькі-што ў сваей заяве абвініў у забастоўцы выключна работнікаў, — адбылося тайнае галасаваньне, якое дало 10 галасоў—**за прыняцьце прапазіцыі ўраду**, каб яму работнікі даверылі вырашэньне сваей спркі з прамыслоўцамі... Камісія далучылася да большасьці і паведаміла лодзкага ваяводу, што работнікі прымаюць арбітраж ураду. Адносна спыненьня забастоўкі Камісія засьцерагла сабе некалькі гадзінаў часу.

Пасьля цэлага раду мітынгаў і нарадаў была прынята аканчальная пастанова. Камісія абвясьціла аб спыненьні забастоўкі...

Вось гэтая характэрная пастанова Камісіі:

„Міжсаюзная Камісія, лічучы, што становішча ўраду, як і прамыслоўцаў, утруджае далейшую барацьбу работніцкай клясы і змушае яе да прыняцьця арбітражу,—адказнасьць за гэта цалком ускладае на правакацыйнае і няўступлівае становішча прамыслоўцаў, а таксама і на ўрад, які побач з прамыслоўцамі імкнецца да галоднае платы работнікам у Польшчы.—Дзеля таго Камісія адклікае забастоўку 21 сакавіка".

Сабраньне дэлегатаў саюзу работнікаў валаконнай прамысловасьці, апрача таго, прыняло ўвечары таго-ж дня рэзалюцыю, якая выражае востры пратэст проці вырашэньня канфлікту шляхам арбітражу. Аднакжа, дзеля таго, што далейшая барацьба — залішне цяжкая, сабраныя прынялі да ведама пастанову Міжсаюзнай Камісіі.

„Польска-радавае зблiжэньне".

Газэты паведамляюць, быццам у апошнія дні можна дагледзіць азнакі „польска-радавага зблiжэньня". У маскоўскіх газэтах зьявілася вестка, быццам улетку сёлетняга году польскі міністар замежных спраў мае аддаць візыту радаваму міністру Чычэрыну, які ў 1925 г. гасьціў у Варшаве. 25 сакавіка ў Варшаве адбылася нарада старшыні Рады Міністраў марш. Пілсудскага з міністрам Залескім і польскім паслом у Маскве п. Паткам — у справе „гаранцыйнага трактату з С С Р Р". У той-жа дзень міністар Залескі прымаў у сябе радавага пасла п. Войкава разам з п. Паткам. Польскі пасол мае неўзабаве выехаць у Маскву — ужо з новымі інструкцыямі.

Ці выйдзе што з гэтых спробаў зблiжэньня, вельмі сумліўна... Як ведама, Польшча знаходзіцца пад вялікім уплывам англійскай палітыкі, якая зусім не заінтэрасавана ў тым, каб — загарантаваць С.С.Р.Р. заходні тыл у час, калі на Далёкім Усходзе разыгрываецца можа апошні акт вялізарнай дуэлі Англіі з ССРР... А для Польшчы, ясна-ж, гэты мамэнт—найвыгаднейшы, бо можна найбольш вытаргаваць для сябе якраз цяпер.

Скарга на закрыцьце Незал. Хлопскай Партыі.

Старшыня Незалежнай Хлопскай Партыі пасол Фідэркевіч заявіў журналістам, што ён падае ў Найвышэйшы Адміністрацыйны Суд скаргу на пастанову міністра ўнутраных спраў, абвясьціўшага партыю — нелегальнай.

Выхад 3 паслоў з Н. П. Х.

Тры паслы, сябры Незал. Хлопскай Партыі (Воевудзкага), заявілі аб сваім выхадзе з партыі, матывуючы гэта тым, што даўно не згаджаліся з яе залішне радыкальным кірункам. Гэта — п. п. Бон, Шакун і Шапель. Два апошнія — беларусы.

Зьезд ваяводаў у Варшаве.

На 2 красавіка назначаны зьезд усіх ваяводаў у Варшаве. Зьезд мае адбыцца ў адзін дзень, ды, як пішуць газэты, кожны з ваяводаў будзе мець голасу ўсяго толькі па 15 мінутаў. Па-ваеннаму!

У справе Адозвы Польскай Лігі Абароны Правоў Чалавека.

Варшаўскі Акружны Суд зацьвярдзіў канфіскату адозвы Польскай Лігі Абароны Прав. Чалав. і Грамадзяніна, у якой зьмешчаны пратэст проці далейшых надужыцьцяў уладаў у вастрогах ды ў паліцэйскіх арыштах. Апрача таго суд пацягнуў да адказнасьці ўсіх падпісаўшых адозву „абаронцаў правоў чалавека і грамадзяніна" ў Польшчы, запраўды-ж — найлепшых людзей з польскага грамадзянства... Гэтыя абаронцы вінавацяцца пракурорам у „непашане да ўлады" і ў „распаўсюджываньні фальшывых вестак, якія могуць выклікаць трывогу ў грамадзянстве"...

У справе амэрыканскай пазыкі Польшчы.

„Дзен. Віл." даведаўся дакладна аб тым, што польскія дэлегаты, езьдзіўшыя ў Амэрыку за „залатым руном", варочаюцца ні з чым. „Пазыкі, праўда, не адмовілі наадрэз, але варункі, на якіх Амэрыка гатова даць пазыку,—такія, што ня толькі абражаюць годнасьць польскай дзяржавы, але папросту б'юць у яе незалежнасьць ды самастойнасьць"... Варункі гэтыя — добра ведамыя: поўны фінансава-гаспадарчы, а ў выніку таго—і палітычны кантроль над польскай уладай, як у ўнутранай, таксама і ў вонкавай яе палітыцы. Але найбольш цікаўна, што газэта цьвердзіць, быццам сучасны польскі ўрад гатовы пайсьці на ўсе гэтыя варункі, каб атрымаць пазыку —„за ўсялякую цану"... Што дзеля таго ён і паслаў у Амэрыку кракаўскага праф. Кшыжаноўскага, гарачага прыхільніка пазыкі—на ўсіх варунках. У канцы газэта дадае, што адно толькі яшчэ можа ўратаваць ад гэтай „небясьпекі" Польшчу: гэта — Сойм, ад якога, паводле Канстытуцыі, залежыць зацьвярдзіць пазыку, ці не. Калі навет урад начхае на Сойм, дык можа крэдытары будуць асьцярожней самі і бяз згоды Сойму ня будуць рызыкаваць грашмі...

Заграніцай.

Паўстанчы рух у Альбаніі.

Альбанскія рэвалюцыянэры распачалі падгатоўку дзеля аказаньня адпору італьянцам, якія рыхтуюцца аканчальна заўладаць Альбаніяй.

На альбанскім узьбярэжжы высадзіліся 100 італьянскіх афіцэраў, якія маюць кіраваць аружнымі сіламі Ахмэда Зогу, які прадаў свой край Італіі.

Рэвалюцыянэры спадзяюцца на дапамогу ў барацьбе з італьянскімі захватчыкамі — на Югаславію, Францыю і ССРР.

Нацiск Англіі з Італіяй на Югаславію.

Яўна рыхтуючыся з дазволу Англіі — да ваеннага захвату Альбаніі, Італія крычыць на ўвесь сьвет аб тым, што Югаславія ўваружаецца дзеля нападу на Альбанію. Італьянскі пасол аддаў белградзкаму ўраду ноту— такога ж зьместу, якая выслана ўсім вялікім дзяржавам. Зараз жа пасьля гэтага да югаслаўскага міністра замежных спраў прыяжджаў англійскі пасол, які заявіў, што—далучаецца да заявы італьянскага пасла. У заяве італьянскі пасол пагражае Югаславіі „фатальнымі вынікамі ад падтрыманьня альбанскіх паўстанцаў", прыводзячы цэлы рад фактаў падгатоўкі Югаславіі да вайны.

Югаслаўскі міністар рашуча запярэчыў усім „фактам", якія падалі паслы.

Гэты цынічны нацiск Англіі і Італіі на Югаславію, каб пакінула безбаронную Альбанію, як дабычу для Італіі, выклікаў страшэннае абурэньне ў Югаславіі.

Найбольш цікаўна ўва ўсей гэтай агіднай акцыі тое, што навет само альбанскае пасольства ў Лёндане пярэчыць весткам аб „мабілізацыі" ў Югаславіі. Альбанскі народ, прадаты сваім дыктатарам Ахмэдам Італіі, сам шукае помачы і абароны ў Югаславіі. Паўстанчы рух шырыцца стыхійна сам сабой.

„Праўда" аб англійска-італьянскай палітыцы.

Абгаварываючы прызнаньне італьянскім урадам Бэсарабіі за Румыніяй, „Праўда" піша, што гэты частковы пасьпех Чэмбэрлена зусім не стварае яшчэ таго процірадавага фронту, аб якім лятуціць Англія. Міжнародавае становішча ССРР—мацней, чым думае Чэмбэрлен. Нямеччына не пайшла на спакусы Чэмбэрлена, не жадаючы зрываць добрыя адносіны з Радамі. Плаціць за гэта Нямеччыне з англійскай кішані Чэмбэрлен не хацеў, а Францыя рашуча адмовілася з свае кішані плаціць за англійска-нямецкае зблiжэньне коштам ССРР. Гэткім чынам ствараецца магчымасьць паразуменьня і з Францыяй. А гэта — тым больш, што Югаславія, якой пагражае супольны англійска-італьянскі нацiск, павінна шукаць помачы і абароны толькі ў Францыі ды ССРР. Умова з Турцыяй і толькі-што падпісаны Трактат з Латвіяй—паралізуюць у значнай меры процірадавыя пляны Англіі, якая пэўна ж будзе і далей шукаць магчымасьцяў ды ходаў, каб шкодзіць ССРР.

Румынія ставіць у Бэсарабіі памятнік Мусоліні.

У падзяку за „падараваньне" Румыніі Бэсарабіі, румынскі ўрад пастанавіў паставіць Мусоліні памятнік у слаўным сваімі пагромамі месьце Кішынёве.

„РОДНЫЯ ГОНІ".

Вышла першая кніжка новай беларускай штомесячнай часопісі „Родныя Гоні". Акуратна выданая кніжачка ў 3 друкаваных ліста (48 старонак) на добрай паперы звонку робіць вельмі добрае ўражаньне. Зьмест першага—сакавіковага—нумару таксама выклікае наагул—здаваленьне.

У звароце „Да Грамадзянства" выдавецтва і рэдакцыя высьвятляюць мэты і імкненьні, якія паставілі сабе, выдаючы часопісь. У цяжкіх варунках матэр'яльнага і духовага жыцьця „беларускі народ выказаў аднак-жа надзвычайную жывучасьць і сілу. Засуджаны сваімі ворагамі на сьмерць, ён паказаў, што ўміраць ня зьбіраецца і пахаваць сябе ня дасьць". Наадварот, ён — „перайшоў ад абароны ў наступ", і вось адным з выразаў гэтага „духовага наступу"—побач з абаронай—зьяўляецца тая мабілізацыя ўсіх жывых сілаў беларускага Духа ў Краі, да якой заклікае часопісь. Пекна кажа адозва, што культура для душы—тое-ж, што паветра для цела. Дык — каб народ мог духова расьці і разьвівацца, трэба ствараць ды разьвіваць яму сваю культуру. Вось гэтую неабходную задачу і стаўляе сабе новая часопісь, клічучы ўвесь беларускі народ да працы на яе „Родных Гонях"...

Новая часопісь, — „месячнік літэратуры і культуры Заходняй Беларусі", як відаць з пад загалоўку і зьместу,—зусім апалітычны. Можна навет гэтую „апалітычнасьць", гэты вельмі характэрны для нашых часоў і нашых палітычных абставінаў нейкі страх перад палітыкай—лічыць значным мінусам для паважнай, адбіваючай усё жыцьцё ў Краі, часопісі. Калі ня слова: „палітычны", дык хай-бы прынамся „грамадзкі" дадалі паны рэдактары да падзагалоўку. Бо слова „культура"—або залішне шырокае, або — залішне вузкае. Трэба думаць, што гэтае „выключэньне палітыкі" зроблена арганізатарамі дзеля таго, каб прыцягнуць да працы культурных і літэратурных дзеячоў усіх кірункаў, якія цяпер неяк пабіліся на групы, пераносячы варожыя адносіны з галіны палітычнай і сацыяльнай барацьбы і ў галіну культурнае працы. А гэта, бязумоўна, блага адбіваецца на агульным балянсе нашага культурнага жыцьця і разьвіцьця... Дык можа выдаўцы і маюць рацыю.

Кніжка адчыняецца пекнымі вершамі ведамай нашай паэткі Наталі Арсеневай, якая, нажаль, залішне пасьпяшыла— славіць вясну... Можна толькі пажадаць, каб гэтыя вершы дайшлі да найбольш закінутых кутоў ды гоняў Беларусі, калі „зацьвіце чарэмха і чарэшня", а „яблынька стане паненкай" — у бела-рожавай вопратцы.

Любі усё, сагрэй каханьнем
Жыцьцё зямлі, жыцьцё людзей.
Табе адкажа лес пяяньнем,
І людзі стануць весялей.

—·—

Цалуй лясы, ідзі гуляці
У палі, ў сады пагодным днём.
Кахай, кахай Зямліцу-Маці,
Палі яе, палі агнём.. —

— пекна заклікае наша „дачка Сонца" свайго Сьветазарнагага Бацьку, вучачы адначасна і сваіх братоў-беларусаў—„быці, як Сонца", дый — кахаці сваю зямлю-маці, як яно...

Добрыя лёгкія вершы А. Бартуля, маладога паэты, абяцуючага добрае разьвіцьцё. Невялічкі — з „настраеньнем" — абраз У. Гр-віча рысуе, вольна карыстаючыся летапісным апавяданьнем, як уцёк з Крэўскага замку-вастрогу Вітаўт ад чакаўшай яго пэўнай сьмерці ад рукі забойцаў прадаўшагася паляком Ягайлы... Гістарычная ілюстрацыя ды пэўнае „мэмэнто" да — распачатых, здаецца, у літоўскім грамадзянстве гутарак аб „польскай вясьне"...

Пад мастацкім пяром ведамага нашага крытыка Антона Навіны, даўшага скарочаны зьмест прачытанай ім у Вільні лекцыі, ажывае перад намі адзін з найлепшых, калі не адзін-адзіны,—наш мастак-апавядальнік, тварэц беларускай новэлі-расказу, **Антон Лявіцкі**. У тонкім дасьледзе сочыць аўтар, як— пад магутным уплывам новых дэмакратычных ідэяў — выяўляюцца ў мастацкай творчасьці сталетнія пласты заляжаўшайся, засуджанай гісторыяй, шляхоцкай клясавай псыхалёгіі, у глыбіні падсьведамага зьвязаныя з уладна-зьвярыным адношаньнем, хаця дробнага, але ўсё ж такі—пана-памешчыка... Як спад гэтых пластоў усё больш — пад уплывам магутнага ўсенароднага ўздыму ды ўзьлёту да волі і роўнасьці — выходзіць — узносіцца перад намі чысты, як у першы дзень стварэньня, **Чалавек**... — Як, вызваліўшыся спад паў-польскай, паў-расейскай скуры, гэты чалавек аказываецца такім — беларускім, якога яшчэ ня было да яго... Гэты невялічкі крытычны абраз—усяго на 7 старонках — запраўдная аздоба кніжкі, адзін з найбольш удатных твораў старога мастака-крытыка.

Трэба тут, скарыстаўшы з прыпадку, паставіць нашым выдавецтвам на чаргу дня дамаганьне, каб чым хутчэй паклапаціліся аб выданьні прынамся найлепшых, калі ня ўсіх у поўным зборы,—крытычных ды гісторыка-літэрацкіх твораў Антона Навіны. Некаторыя з іх выданы ўжо ці паасобна, ці навет невялічкімі зборнікамі, але выданы ўжо даўно. — Дык, ведама-ж, і разыйшліся ўжо цалком, дый параскіданыя, ня творачы разам адзінага цэлага, зусім не даюць пойму аб тым, што мае беларуская літэратура ў асобе Навіны.

Кароткія гісторыка-літэрацкая заметка І. Дварчаніна дае — на падставе цікаўнага дамыслу менскага праф. Шчакаціхіна—дасьціпныя разважаньні аб годзе нарадзінаў нашага вялікага гуманіста Фр. Скарыны, у выніку якіх можна лічыць, калі ня сьцьверджанай аканчальна, дык прынамся найбольш пэўнай гэтую дату—на 6 сакавіка 1486 г.

Другі наш малады філёлёг даў контрпалямічную заметку, у якой з трыумфам, праўда, лішне лёгкім,—зьбівае „крытыку" на беларускі пераклад „Эвангэльля паводле Лукі", нядаўна выпушчаны выдавецтвам „Компас" у Лодзі—крытыку, як відаць, папросту, мягка кажучы „няпісьменную", хаця-б, здавалася, ад прадстаўніка царквы, які прэтэндуе на веданьне белар. мовы, можна было б спадзявацца большай паважнасьці, прынамся—асьцярожнасьці...

Невялічкая заметка — „Аб культурнай працы", як мы даведаліся, прысланая з глухога кута нашага Краю, даводзіць красамоўна, што „ў палескай глушы" заварушылася самастойная думка ды воля да культурнай працы і харашэйшага жыцьця... Шкада, што гэтым стыхійным імкненьням так мала адказывае дый яшчэ менш дае наша глухая ды цемная сучаснасьць..

Артыкул С. П., які належыцьца, здаецца, пяру аднаго з найлепшых нашых педагогаў, дае пачатак высьвятленьня падставаў

Пратэст Радаў.

Радавы ўрад заявіў у Рыме пратэст проці прызнаньня італьянскім урадам румынскага панаваньня над Бэсарабіяй.

Латвійскі ўрад пацьвярджае нэйтралітэт Латвіі.

Латвійскі міністар замежных спраў Цэлэнс заявіў у прамове ў Лібаве, што сучасны ўрад будзе няўхільна баранісь прынцып нэйтралітэту Латвіі—на выпадак нападу якой дзяржавы на СССР.

Перагаворы Вальдэмараса з Цэлэнсам.

Польская прэса ў сэнсацыйнай форме падае вестку аб вельмі важных перагаворах, якія галава літоўскага ўраду вёў з латвійскім міністрам заграніцных спраў у часе пахаронаў прэзыдэнта Латвіі, Чаксьтэ.

Судзячы паводле тону газэт, відаць, што перагаворы гэтыя — непамысныя для польскае палітыкі.

Узнаўленьне перагавораў між СССР і Францыяй.

У Парыжу распачалася ізноў праца камісіі ў справе ўрэгуляваньня расейскіх даўгоў Францыі, якое зьявілася-б першым крокам да заключэньня гандлёвай умовы між абодвума краямі. Але на першых-жа паседжаньнях выявіліся ізноў вялікія супярэчнасьці між абедзьвюма старанамі.

Радавая дэлегацыя перадусім заявіла, што ўрад СССР рашуча і прынцыпова — не прызнае ніякіх даўгоў царскага ўраду, але гатовы ахвяраваць пэўную, вельмі значную суму на пакрыцьце стратаў дробных уласьнікаў былых расейскіх цэнных папераў (пазыкаў). На гэта радавы ўрад згаджаецца штогодна выплачваць вялізарную суму—па 55 мільёнаў франкаў у працягу 63 гадоў... Але французам гэтага паказалася мала: яны патрабавалі—па 82 мільёны ў год... Да таго-ж французы трэбуюць поўнага прызнаньня іх варункаў, а пасьля толькі згаджаюцца весьці далейшыя перагаворы аб крэдытах і інш. Радавая дэлегацыя, наадварот, трэбуе, каб першым чынам Францыя згадзілася прынцыпова пазычыць СССР паўмільярда франкаў—у таварах...

Есьць весткі, што на Францыю, якую радавая дыпляматыя хоча неяк адцягнуць ад Англіі — шляхам уступак у справе даўгоў, — страшэнна націскае Англія, каб не ўступала Радам. Але — ці Францыя, якую Англія б'юць на кожным кроку (—у Югаславіі, у Альбаніі, у Румыніі, Польшчы і шмат дзе яшчэ), — адмовіцца ад карысных умоваў—дзеля „пекных вочаў" Англіі?

Нямеччына разбурывае крэпасьці.

Нямецкі ўрад паводле сумленна выпаўняць парыскую ўмову ў справе разбурэньня часткі ўкрапленьняў, пабудаваных удоўж польскае граніцы — пад Кенігсбэргам і ў іншых мясцох.

Недахват у ангілійскім бюджэце.

Недахват у ангілійскім бюджэце ў гэтым годзе (бюджэтны год у Англіі канчаецца 31 сакавіка) аблічаны на 40 мільёнаў фунтаў, ці 20 мільёнаў даляраў. Далася ў знакі англійцам кітайская авантура!..

Злагоджаньне канфлікту між Мэксікай і Амэрыкай.

Амэрыканскі сэкрэтар замежных спраў заявіў, што няма больш небясьпекі вайны з Мэксікай. Мэксіка згадзілася ўсе спрэчныя пытаньні выращыць шляхам перагавораў, уступіўшы перад усім у справе нафтавых крыніцаў. Газэты дапускаюць, што Мэксіка пайшла на ўступкі з прычыны вельмі рашучых нотаў з боку амэрыканскага ўраду. Зьмест гэтых нотаў трымаецца ў вялізарным сэкрэце.

На Усходзе Эўропы.

Невалічкая Латвія раптам выклікала страшэннае парушэньне ўва ўсім сьвеце: латвійскі ўрад падпісаў **трактат прыязьні** з з сваей магутнай суседкай—СССР. Абураныя гэтым буржуазныя дзяржавы Захаду, каб паменшыць уражаньне ад гэтага кроку, пашыралі весткі, быццам трактат падпісаны яшчэ не цалком, дый не абязвывае яшчэ дагаварыўшыхся старон. Але весткі гэныя аказаліся не праўдзівымі. Трактат падпісаны цалком. Не ўстаноўлены аканчальна толькі дробныя „дадаткі" да яго.

Як высьняецца, апошнім таўчком, які папхнуў латвійскі ўрад на станоўчы крок у кірунку паразуменьня з Радамі, аказаліся добра ведамыя ўраду падрыхтаваньні ў Латвіі да **фашыстаўскага перавароту**, падобнага да таго, які адбыўся і дзе інш — па суседзтву, а перадусім — у Літве. Ня трэба было ўраду мець 8 вочаў на азадзіне, як у павука, каб—пасьля літоўскіх падзей—зьвярнуць увагу на аналягічную акцыю, кіраваную ў Латвіі тэй-жа рукой, поўнай залатых фунтаў... Дык латвійскай дэмакратыі, на чале з сацыял-дэмакратычным урадам, трэба было выбіраць: або пакланіцца ваенна-фашыстаўскаму боту, кіраванаму лёнданскім моноклем (шкло на адно вока, якое носіць пан Чэмбэрлен), які маючы сваі сусьветна-палітычныя мэты, глядзіць на Латвію, Літву, Польшчу і інш. жывыя дзяржавы, як на шашкі на шахаўніцы, ды не задумаецца папхнуць іх на сьмяротную бойню, а мо' і на гібель у вайне з Радамі; або, гледзячы на сябе, свой лёс і эканамічную залежнасьць ад магутняй усходняй суседкі, дагаварыцца з ёй беспасрэдна ды забясьпечыць сабе ня толькі жыцьцё і граніцы, але і—гаспадарчы дабрабыт. Латышы выбралі тое, што лічылі для сябе больш карысным.

Але, відаць, латвійская, хоць і вельмі нячысьленая, буржуазія глыбока заразілася фашыстаўскай хваробай... „Абоз Вялікай Латвіі" распачаў страшэнную агітацыю проці паразуменьня з Радамі. У краёвай прэсе распачалася страшэнна вострая кампанія проці трактату. Адначасна заварушыліся і падпольныя арганізацыі фашыстаў, якія не пакінулі думкі аб пераввароце. Аб гэтым ярка сьведчыць нязвычайная для.. міністра заграніцных спраў, аўтара і абаронцы трактату з Радамі, адозва, якая **заклікае латвійскіх работнікаў — стаяць на варце ў поўнай баявой гатоўнасьці**, каб у кожны мамэнт разьбіць рыхтаваны ў падпольлі фашыстаўскі замах. З гэтага відаць, што фашыстаўская буржуазія ў Латвіі правакуе амаль ня хатнюю вайну... Ня трэба вялікага спрыту, каб зразумець, што гэтыя дарэмныя высілкі толькі далей папхнуць латвійскую дэмакратыю да збліжэньня з СССР.

Гэты пасьпех радавай дыпляматыі ў Латвіі **разьбівае англійскі плян ваеннага і „эканамічнага акружэньня СССР**, ды адрэзаньня яго ад рэшты Эўропы. Трэба дадаць, што радава-латвійскі трактат прадбачыць і **адыход Латвіі ад Лігі Народаў**, што ня менш непакоіць кіраўнікоў апошняе... Справа ў тым, што ўжо Нямеччына ў Рапальскім Трактаце абязалася ня прымаць учасьця ў ваеннай і гаспадарчай супольнай акцыі сяброў Лігі проці Радаў, калі-б Радавы Саюз быў прызнаны Лігай за „вінавайцу новай вайны"... На гэтай падставе Нямеччына патрэбавала, каб Ліга звольніла яе ад гэнага абавязку. Ад гэтага страшэнна пахіснулася ўся тая „процірадавая крэпасьць", якая была пабудавана ў лоне Лігі Народаў. А вось цяпер гэткі самы „вынятак" зроблены і Латвіяй, ня кажучы ўжо аб тым, што вельмі падобны Трактат падпісаны з Радамі і Літвой... Гэткім чынам выходзіць, што магутная жэнэўская „Пані" зусім траціць сваё „вдзенкі" — на Усходзе Эўропы, дзе пачынаюцца ўплывы нейкай зусім іншай, але ня менш магутнай „Пані"...

Як цяпер будзе з Эстоніяй, цяжка прадбачыць. У Эстоніі ўрад — чыста буржуазны, падобны да сучаснага літоўскага. Трэба толькі дадаць, што эстонскае грамадзянства — значна больш палітычна і гаспадарча дасьпелае і дзеля таго больш незалежнае, чым літоўскае. Ня трэба забывацца і аб тым, што між Эстоніяй і Латвіяй істнуе ня толькі цеснае гаспадарчае паразуменьне, але і— **мытная ўнія**. А ведама ўсім, якую важную ролю ў дзяржаўным аб'яднаньні Нямеччыны адыграла мытная ўнія...

Што эстонскае грамадзянства перадусім цьвяроза заглядаецца на справы свайго дзяржаўнага быту і сваей заграніцнай палітыкі, аб гэтым зусім нядаўна казаў эстонскі пасол у Парыжу п. Пуста — у сваей лекцыі ў унівэрсытэце ім. Карнэджы. Ен даў вельмі цікаўны гістарычны агляд зьмяняўшыхся плянаў аб'яднаньня балтыцкіх дзяржаваў — ад 1919 г. да нашых дзён. Сьпярша дыпляматыя балтыцкіх дзяржаў, створаных на землях былой Расеі, лятуцела ды працавала над стварэньнем вялікага блёку ўсіх дзяржаў, якія ляжаць навакол Балтыцкага мора: Скандынаўскіх (Швэцыі, Нарвэгіі, Даніі), Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы. Пасьля неяк высьнілася, што лятуценьні аб Скандынавіі трэба пакінуць... Пасьля сталася ясным, што трэба пакінуць думку і аб Польшчы, якая якраз высоўвала сябе ўсьцяж на становішча „павадыра" Балтыцкай Уніі... Пасьля з чатырох астаўшыхся дзяржаў рэальна можна было гутарыць толькі аб трох, бо Фінляндыя адпала... Крыху пазьней неяк аддзялілася і Літва. Эстонія асталася толькі з аднэй Латвіяй, з якой і заключыла цесную мытна-гаспадарчую ўнію... З рэштай дзяржаў (з трыма) падпісаны толькі трактаты прыязьні. „Гэта — вельмі скромны рэзультат, які астаўся ад вялікіх лятуценьняў і плянаў, але гэты рэзультат за тое— зусім рэальны"... „Дык можа, выходзячы з гэтага рэальнага і трывалага саюзу з Латвіяй, можна будзе дайсьці да нечага яшчэ шырэйшага, але ня менш рэальнага"...

З гэтага відаць, што цьвярозы эстонскі палітык рашуча адкідае той фантастычны ды небясьпечны мэтад міжнародавай палітыкі, які быў накінуты Эстоніі хворым рамантызмам некатарых балтыцкіх дзяржаваў у 1919 г., а выбраў рашуча **мэтад рэальнага гаспадарчага інтарэсу**. Калі мець на ўвазе, што якраз цьвярозая сьведамасьць сваіх рэальных гаспадарчых інтарэсаў папхнула латвійскі ўрад адкінуць прапанаваны яму небясьпечны мэтад „барацьбы з Радамі" ў саюзе з... Лігай Народаў і выбраць саюз з СССР, — дык можна прадбачыць, як пойдзе далей справа адносінаў паміж С.С.Р.Р. і Эстоніяй.

Шчыра дзякую ўсім грамадзянам, якія прынялі ўчасьце ў пахаваньні майго бацькі,

Уладзімера Канчэўскага.

Арсень Канчэўскі.

Вронкі (турма).

творчай працоўнай школы. Здаецца, гэта—частка тых лекцыяў, якія аўтар чытаў на курсах для беларускіх настаўнікаў—у 1926 годзе. Артыкул — крыху расьцягнены, але ўвесь дышыць глыбокай верай аўтара ў прапагаваны ім тып школы, нажаль, пакуль — што, недаступны для нашага грамадзянства, пазбаўленага амаль-што не ўсялякіх матэрыяльных дый іншых магчымасьцяў тварыць жыцьцё свайго народу паводле найлепшых прыкладаў і ўзораў, апрацаваных сусьветнай культурай..

Яшчэ больш спэцыяльна навуковага характару мае вялікшы артыкул маладога працаўніка навукі, А. Зянюка, — аб „Зямельных адносінах у Беларусі і аграрнай палітыцы канца XIX сталецьця". Такога-ж зьместу лекцыю аўтар чытаў нядаўна ў Вільні.

Аддаючыся навуковаму дасьледу, аўтар ніколі ня траціць з вачэй жывой сувязі з жыцьцём народным,—тым больш разважаючы такую падставовую справу для нашага народу, як—зямельная. Трэба пажадаць, каб аўтар працаваў далей над першай важнасьці тэмай, даўшы нам агляд „зямельнай гісторыі" і ў бліжэйшыя да нас — у часе і прасторы—пэрыяды.

Добрай выдумкай Рэдакцыі зьяўляецца аддзел беларускага фольклёру, які ў першым нумары прадстаўлены толькі — аднэй народнай песьняй. Трэба ведаць, што усё тое, што калісьці разглядалася ў падручніках ды зборніках, як „памятнікі народнага творства", для нашага народу — зусім ня нейкія „памятнікі старыны", але — жывая духовая атмасфэра, у якой ён жыве, на аснове якой павінна тварыцца і далейшая духовая культура народу—сіламі яго новых мастакоў. — Бо-ж культура — запраўднае паветра, якім дыхае народ...

У канцы кніжкі дадзена, праўда, вельмі няпоўная хроніка культурнага жыцьця Заходняй Беларусі, у якой на першым пляне стаіць інфармацыйны аддзел Таварыства Беларускай Школы. Трэба станоўча парадзіць п. п. рэдактаром, каб значна пашырылі гэты аддзел, уключыўшы ў яго—хроніку палітычнага жыцьця Зах. Бел. і агляд культурнае працы Беларусі Усходняй.

У канцы Выдавецтва разсказывае аб тым, як паўстала ініцыятыва выданьня часопісі, ды як арганізавана—на паявых падставах—самае выданьне.

У заключэньне кароткага агляду трэба пажадаць новаму сябру нашай вельмі нячысьленай журнальнай сям'і—ў дзень яго нарадзінаў—здароўя і многіх гадоў жыцьця на карысьць культурнага разьвіцьця нашага народу. Можа й запраўды абставіны ў нас зложыліся так, што пакуль-што на першую чаргу трэба будзе паставіць нашаму грамадзянству культурную, а не палітычную працу*). Але трэба памятаць ды разумець, што можа **найбольш жыцьцяздольныя моцныя і трывалыя палітычныя факты творацца якраз не палітычнымі срэдствамі, але — культурнай працай...**

Культурнік.

*) Друкуючы гэту стацьцю беларускага культурнага дзеяча, ведамага сваім палітычным чуцьцём, Рэдакцыя засьцерагаецца, што з гэтым паглядам ня зусім згаджаецца: жывы народ ня можа ня цікавіцца палітычнай працай, бо і дзеля культурнага творства патрэбна акурат... палітычная воля! Адно бяз другога—немагчыма!

Рэд.

ХРОНІКА.

Чарговая канфіскацыя. У тым тыдні сканфіскавана камісарам ураду на м. Вільню аднаднёўка „Водклік" за зьмяшчэньне ў ёй гэткіх стацей і заметак:

1) перадавіцу „Дзьве ідэалёгіі";

2) стацьцю на 9-ыя ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі „У гістарычны дзень" (1918—25/III—1927);

3) перадрук з польскіх газэт заметкі „Сэнсацыйныя весткі" (аб польска-літоўскіх адносінах);

4) за стацьцю „Пасьля лодзкае забастоўкі";

5) за заметку ў хроніцы: „Да сьвяткаваньня ўгодкаў незалежнасьці Беларусі".

6) за „некаторыя з карэспандэнцыяў" (точна паказаць, якія у камісарыяце ўраду адмовіліся!).

Ізноў эндэцкая брахня. Обстаўскі „Dzien. Wil.", каб пасеяць у грамадзянстве недаверые да Беларускага Каап. Банку ў Вільні, пусьціў брахлівую чутку, быццам Банк і абодва яго аддзелы (ў Пінску і Глыбокім) зьліквідаваны ўладай. Эндэцкую брахню ўраз жа падхапілі абедзьве выдаваныя ў Польшчы расейскія эміграцкія газэты — „Виленское Утро" і варшаўская „За Свободу". Пэўне-ж усе тры пойдуць за гэта пад суд і заплоцяць дорага за зробленую Банку брахнёй гэнай шкоду.

Звальненьне грам. Васілеўскага. Кіраўнік пінскага аддзелу Белар. Каап. Банку грам. Васілеўскі, які быў арыштаваны аднача сна з дырэкцыяй віленскае цэнтралі, — звольнены гэтымі днямі пад залог 1.000 злот.

Пратэст проці незаконнага цыркуляру. Як ведама, віленскі куратар загадаў, каб беларускія, жыдоўскія і літоўскія школы ўвялі ў сябе ў 1, 2 і 3 клясах выклад гісторыі Польшчы ў польскай-жа мове.

Дэлегацыя ўсіх трох зацікаўленых нацыянальнасьцяў зьвярнулася была да куратара з пратэстам проці гэтага беспадстаўнага загаду. На гэта ім было адказана, што яны могуць жаліцца міністру асьветы, а да рэзалюцыі міністра загад будзе прыпынены.

Тады паехала ў Варшаву спэцыяльная дэлегацыя ад беларускіх (сэн. Уласаў), жыдоўскіх і літоўскіх культурна-асьветных установаў з супольным мэмарыялам у гэтай справе. Міністар асьветы д-р Добруцкі адмовіўся прыняць дэлегацыю цалком і прымаў прадстаўнікоў кожнае нацыянальнасьці асобна. Аднак, гэта не зьмяніла салідарнага становішча ўсіх трох дэлегацыяў. Міністар заявіў, што яму нічога ня ведама аб гэткім дамаганьні міністэрства, ды што ён сам прызнае яго неабаснаваным. Міністар абяцаў разважыць справу ў прыхільным для дэлегацыі духу.

Сьвяткаваньне 25 сакавіка. Дзевятыя ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі (не Савецкае, як піша Обст, а Беларускае Народнае Рэспублікі!). Бел. Нац. Камітэт адзначыў урачыстым паседжаньнем,—на жаль, закрытым. На паседжаньне прадстаўнікі сельсаюзьнікаў і хадэкаў ня прыйшлі.

Затое сельсаюзьнікі і хадэкі—з спэцыяльнага дазволу ўлады—зрабілі сваё асобнае сьвяткаваньне,—ведама ж, за чаркай гарэлкі. Ня гледзячы на даўгую падгатоўку і вялікую агітацыю, сабралося на іх банкет у рэстаране „Жоржа" вельмі мала беларусаў, дый то першае месца займалі Мамонькі, Косьцевічы, Умястоўскія і т. п. Беларускае грамадзянства ясна паказала, што ў часе найвастрэйшых рэпрэсіяў—сорамна банкетаваць! Адзначыў гэта на банкеце ў дужа далікатнай форме навет прадстаўнік палякоў адв. Абрамовіч, успомніўшы аб „сьвежых ранах"...

Вечар у Віл. Белар. Гімназіі. У пятніцу, 25 сакавіка, у Гімназіі адбыўся вечар на карысьць незаможных вучняў. Ставілі п'есу ў 3-х актах „Пашыліся ў дурні" пад рэжысэрыяй грам. Замэцкага і з учасьцем яго-ж, грам. Міхалевіча і вучняў ды вучаніц гімназіі. Пастаноўка была дужа ўдалая. Праграму дапоўнілі выступленьні вучняў дэкляматараў, вучнёўскага аркестру і хору, якія ўсьцяж робяць відочны поступ. Публікі была перапоўненая саля; выступленьні моладзі сустрэлі дужа прыхільны прыём.

„Бібліатэка для моладзі". Заслужонае ў беларускім руху Беларускае Выдавецкае Таварыства прыступіла да друку кніжак для моладзі. Першая сэрыя складаецца з гэткіх шасьцёх твораў (перакладзеных): 1) Робінзон Крузо; 2) Амічыса: Сэрца; 3) Р. Кіплінга: Кніга джунгляў; 4) Марка Твэна: Прыгоды Гука Фіна; 5) Бічэр Стоў: Хата дзядзькі Тома; 6) Нямцовай: Бабулька (з чэскае мовы). Праца над перакладамі йдзе поўным ходам, і рукапісы ў найбліжэйшыя дні будуць ужо аддадзены ў друк.

Трэба шчыра прывітаць пачынаньне Таварыства ў кірунку здаваленьня духовых патрэб беларускае моладзі, даючы ей добрую кніжку да чытаньня.

Лекцыя д-ра Я. Станкевіча. У мінулую суботу ў Цэнт. Гуртку Т-ва Белар. Школы прачытаў дужа цікаўную лекцыю д-р Ян Станкевіч. Лектар адзначыў галоўныя эпохі ў гісторыі беларускае культуры—пачынаючы ад пра-гістарычных часоў і пераходзячы да найнавейшага пэрыяду. Асабліва цікаўна былі асьветлены эпохі „літоўская" і „ўкраінская", пры чым выясьнены тыя прыёмы, якімі стараюцца ўзьвялічыць свой культурны капітал у мінулым суседнія з намі народы: літвіны і ўкраінцы, — коштам беларусаў.

Ня гледзячы на тое, што аб лекцыі нідзе ня было абвешчана (аднаднёўка „Водклік" з абвесткай была сканфіскавана),— публікі было даволі шмат, што сьведчыць, што хадзіць на суботнія лекцыі ў Гурток шмат для кого сталася ўжо няўхільнай патрэбай.

„Хрэстаматыя Новай Беларускай Літэратуры. Вышаў першы сшыток гэтае прост неабходнае сягоньня кніжкі, укладзенай І. Дварчанінам. У гэты сшыток (82 стр.) увайшлі выбраныя творы Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага), Каруся Каганца (Казімера Кастравіцкага), Альбэрта Паўловіча і „Цёткі" (Алёізіі з Пашкевічаў Кайрысовай). Падбор твораў датасаваны да курсу беларускае літэратуры ў сярэдніх школах. І па зьместу і па вонкаваму выгляду кніжка робіць вельмі добрае ўражаньне.

У найбліжэйшым часе выходзе другая кніжка „Хрэстаматыі" (Янка Купала, Якуб Колас).

„Заранка". Вышаў з друку № 1 журнала для дзяцей пад назовам „Заранка". Маленечкая кніжачка, 16 страніц, у вокладцы з прыгожым рысункам. Выходзе раз у месяц.

Ідэя „Заранкі" — вельмі добрая, якая мае даць школьнікам наймалодшых клясаў цікаўны матэрыял да чытаньня. Есьць тут і вершыкі, і невялічкая заметка аб паэце Алесю Гаруну, і папулярны выклад аб агні— ў форме апавяданьня, і пра вясну, і казка народная, і аб майстраваньні дзіцячых цацак, і ўрэшце—загадкі і „круцігалоўкі".

Зьмест падабраны добра. Відаць, што людзі з любасьцяй бяруцца за работу. Адно бяда—шмат абмылак у тэксьце, у чым, як кажуць, вінавата неакуратнасьць друкарні.

Але ёсьць і заганы, якія трэ ўзлажыць на адказнасьць Рэдакцыі: грахі ў мове. Такія выражэньні, як „шак" (польскае „wszak"), як „усклівуў" (расейскае „воскликнул"), як „дабрадзейца" і інш.,—не павінны ўжывацца ў кніжцы для дзетак, якіх, наздварот, трэ прывучаць да чыстасьці мовы.

Спадзяемся, што да працы ў „Заранцы" возьмецца больш ахвочых рук, дык і гэтыя заганы самі сабой счэзнуць!

Рэдагуе і выдае „Заранку" грам. Л. Войцікова.

Каапэратыўнае жыцьцё. Пасьля разгрому беларускае каапэрацыі, кіраўніцтва нашым каапэратыўным жыцьцём узяў на сябе

Віленскі Аддзел Саюза Каапэрат. Польскае Рэспублікі. Бачучы, у якім сумным палажэньні знаходзіцца цяпер наша вясковая каапэрацыя, Віленскі Аддзел, у які перытварыўся былы Саюз Каапэратываў нашага краю, склікае на 3 га красавіка ў 9 гадз. раніцы канфэрэнцыю ў Вільні (М. Пагулянка № 12), на якой будзе прачытаны рад дакладаў і адбудзецца абмен думак у гэтых справах: 1) Справа прыцягаваньня сяброў (даклад Ф. Домбровскага); 2) Лічэбны стан сяброў у каапэратывах віленскага вокругу і способы поляпшэньня яго (дакл. Л. Арэхвы), 3) Справаздача з дзеяльнасьці Аддзелу за 1926 год (дакл. А. Лозіньскага); 4) Справы зьезду (даклад Ф. Домбровскага); 5) Дзень каапэрацыі ў 1927 г. (дакл. Г. Ясеньскага); 6) Плян работы і выбары Акружное Рады (таго-ж); 7) Вольныя прапазіцыі.

У канфэрэнцыі маюць права прыняць учасьце сябры надзорчых рад і ўпраў каапэратываў, а так-жа асобы, якія чынна працуюць у прапагандова-асьветнай галіне.

Паседжаньне Радных Касы Хворых. Праўленьне Касы Хворых м. Вільні запрашае ўсіх Радных на паседжаньне, якое адбудзецца 30 га сакавіка 1927 г. у 8 гадз. увечары ў салі засяданьня Гарадзкой Рады для разгледжаньня праекту новага Уставу аб абавязкавам забясьпечаньні ў выпадку хваробы, аб забясьпечаньні работнікаў на выпадак нягдольнасьці да заработку, а так жа сямей на выпадак сьмерці забясьпечанага.

Спраставаньне. У аднадйеўцы „Наш Водклік" пры расцэнцы кніг таннае прадажы ўкралася абмылка напісана: „Родны край" III—IV ч. замест 1 зл.—50 гр. Трэба—замест 3 зл.—1 зл. 50 гр.

Афіцыяльны курс грошы на 29 сакавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

29./III на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Рэвізія Віл. Белар. Гімназіі.

24 сакавіка ў Віленскай Беларускай Гімназіі, па даручэньню міністра асьветы, дэлегатам ураду п. Янушам Ендржэевскім была зроблена рэвізія.

Рэвізор быў на лекцыях матэматыкі, польскае і беларускае мовы, псыхалёгіі і арытмэтыкі, падоўгу затрымліваючыся на кожнай лекцыі.

Фармулюючы свае агульныя ўражаньні, дэлегат выразіў здаваленьне пасьпехамі вучняў. У сувязі з гэтым, у размове з пэдагагічным пэрсаналам, дэлегатам была закранута справа наданьня матуры для канчаючых гімназію вучняў.

Пасьля лекцыяў дэлегат аглядаў вучнёўскі інтэрнат, дзе з прыемнасьцяй адзначыў парадак і чыстату ўтрыманьня памяшчэньняў. Істнуючая ў інтэрнаце вучнёўская пераплётная выклікала прыемнае зьдзіўленьне ў дэлегата.

Вучыцялі Гімназіі адзначаюць, як рэдкае зьявішча, тое, што дэлегат падыйшоў да пэдагогаў без прадузятасьці — ня ў прыклад другім — як прыездным, так мясцовым рэвізорам, якім ці то нястача часу, ці то вялікі гонар ніколі не дазваляе навет заглянуць у вучыцельскі пакой... Ці не ад таго сплятаецца навакол гімназіі, з багаслаўленьня п. Обста, гэтулькі ўсялякага роду баек, інтрыг, падазронасьці, абвінавачаньняў у нелаяльнасьці, камунізьме, і інш.

Чарговыя лекцыі.

Цэнтральны Гурток Т-ва Белар. Школы ў Вільні ладзіць у красавіку наступныя лекцыі:

2-га: Што такое дзяржава, і як яна ўтварылася (гр. М. Мэнке).

9 га: Аб радыо (інж.-электр. А. Трэпка).

30-га: Расейцы і мы (д-р Я. Станкевіч).

У маі (траўні):

7-га: Найнавейшая беларусая паэзія (д-р І. Дварчанін).

14-га: Аўтарскі вечар маладых паэтаў.

21-га: Аб мастацтве (грам. Сергеевіч).

28 га: Вечар пасьвячоны творчасьці Максіма Багдановіча (ў 10 ўгодкі сьмерці Яго).

Лекцыі адбываюцца па суботам, у 7 гадз. увечары, у памяшчэньні Таварыства (вуліца сьв. Анны 2).

× Мы ніжэйпадпісаныя жыхары вёскі Варонічы, Куранецкае гміны, Вялейскага павету сцьвярджаем, што ў канцы сьнежня месяца 1926 году прыехаў у нашую вёску заступнік Вілейскага Школьнага Інспэктара і прывёз з сабой дэкларацыі на польскай мове, якія ў канцы канцоў застаўляў нас падпісываць. Мы, ня ведаючы польскае мовы, падпісываліся пад імі, бо ён казаў, што гэта дэкларацыі на беларускую школу, але цяпер пачуўшы, што ад інспэктара езьдзяць цяпер людзі і нагаворываюць людзей, падпісываць дэкларацыі на польскую школу, баламуцячы людзей, што гэта дэкларацыі на беларускую школу. Што гэта баламуцтва, можна вывясьці з таго: на што-ж па колькі разоў складаць дэкларацыі, калі мы выявілі сваю волю, злажыўшы дэкларацыі першы раз на сваю родную беларускую школу?

На падставе вышэйпададзенага заяўляем публічна, што нас абаламуцілі і што мы ніколі не падпісываліся на дэкларацыях на польскую школу, а калі гэта зрабілі праняты хітрасьцю і баламуцтвам—дык мы гэтага не прызнаем, у чым і падпісываемся.

На арыгінале подпісы: Апанас Хоміч, Васіль Новік, Васіль Пасьлед, Міхал Палюшкевіч, Мар'я Пасьлед, Сем. Лях, за няграматнага Міхала Ткачука расьпісаўся Піліп Новік, Ніна Паўловіч, А. Новік, Арсень Гіль, Зьмітрук Ясінскі, Настася Новік, Васіль Рыжэвіч, Пётра Чаўлытка, Павал Чаўлытка, за няпісьменнага Сымона Чаўлытка расьпісаўся Пё[illegible] Мікалай Чаўлытка, Зьмітрук [illegible]ьцяпан Бобрык, Юры Пільнік, Лявон Пятроўскі, Хведар Пятроўскі, Антон Пятроўскі, Іван Стрыжэўскі.

З Радавае Беларусі.

Мастацкая хроніка.

Канцэртмайстар Бел. 1-га Дз. Тэатру І. Фідлон напісаў квартэт на беларускія матывы.

Выкананы сярод абмежаванага музычнага кругу, квартэт быў сустрэты вельмі добра.

Складзена юбілейная камісія, якая кіруе справаю азначэньня стагодзьдзя з дня сьмерці вялікага музыкі Бэтховэна. Камісія вызначыла два публічныя канцэрты і адзін зачынены канцэрт Музтэхнікуму.

Адзін з публічных канцэртаў будзе прысьвечаны камернай музыцы Бэтховэна, другі—вялікім сымфоніям кампазітара. Ёсьць думка выканаць на другім канцэрце выдатны твор музыкі, яго 9-ю санату.

Канцэртамі будзе кіраваць М. Купэр.

Усячына.

Экспэдыцыя на поўнач.

У Ленінградзе ідзе падрыхтоўка да першай навуковай экспэдыцыі на поўнач на дырыжаблі. Палёт распачнецца з Ленінграду на Мурман, далей праз паўночнае канцавосьсе на Аляску з ухілам да Таймырскай паўвыспы і Паўночнай Зямлі. Галоўная задача экспэдыцыі—досьледы Таймырскай паўвыспы, Паўночнай Зямлі і іншых паўночных частак, прылягаючых да ССРР. Экспэдыцыя будзе мець міжнародны характар, прычым выдаткі па палёту будуць разложаны паміж усімі дзяржавамі, якія ўваходзяць у склад таварыства па вывучэньню паўночных краін. Экэнэр, дырэктар нямецкага т-ва „Цэпэлін", прадстаўляе свой дырыжабль дзеля палёту на адзін месяц. У далейшым маецца на мэце пабудаваць уласны дырыжабль. У Ленінградзе і Мурманску намячаецца пастройка мачт для дырыжабляў.

Лётаючая лодка з парусамі.

Нямецкі вынаходца пабудаваў лётаючую лодку, якая мае мачты і парусы. У часе палёту лодкі мачты складаюцца. Калі-ж лодка спускаецца на ваду, мачты падымаюцца, і лодка можа далей плысьці пад парусамі. Хуткасьць лодкі ў паветры—каля 250 кілёмэтраў у гадзіну. Па вадзе яна праплывае каля 10 кілёмэтраў у гадзіну. Увосень мае адбыцца пералёт на лодцы з Гамбургу ў Нью Ёрк праз Атлянтычны акіян.

Фордызацыя самагубстваў.

Адзін з буйнейшых багацеяў Амэрыкі Джэкоб Эльліс надумаўся пакончыць сваё жыцьце самагубствам у дзень семдзесят першай гадавіны ад нараджэньня. Дзеля гэтай мэты ён злучыў мэханізм гадзіньніка з курком рэвальвэра так, каб у момант яго нараджэньня рэвальвэр аўтаматычна выстраліў. Затым сеў у крэсла перад такой „пякельнай машынай" чакаць сьмерці. У ўстаноўлены час рэвальвэр выстраліў, але „вынаходца" аказаўся выпадкова толькі параненым. Цікавае самагубства закончылася падпіскай у паліцыі, што няўдалая спроба больш не паўтарыцца.

З Таварыства Беларускае Школы.

Паведамленьне.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы зьвяртаецца да ўсіх гурткоў Т-ва, якія заложаныя і істнуюць на тэрыторыі дзейнасьці Горадзенскай Акружной Управы і да ўсіх грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі Горадзенскага пав., і жадаюць уступіць у сябры Т-ва, залажыць гурток, адчыніць народны дом, бібліатэку-чытальню каб надсылалі заявы і зьвярталіся па ўсім гэтым пытаньням у Горадзенскую Акружную Управу (Горадня, Парахавая вул. № 4 пам. 42) а не ў Галоўную Управу, як некаторыя рабілі дагэтуль, бо ўсе заявы і паперы па гэтым пытаньням будзе Галоўная Управа перасылаць нам для выпаўненьня. Дзеля гэтага просім не наражаць Галоўную Управу на лішнія карэспандэнцыйныя расходы.

Горадзен. Акр. Управа
Т-ва Беларускае Школы.

Падзяка.

Глыбоцкая Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы прыносе шчырую падзяку за прысланыя ахвяры на будову беларускай гімназіі ў Глыбокім: Мікалаю Глінскаму—за 10 руб. зол., Пятру Глінскаму, Уладзіміру Мятле, Мікалаю Кабаку і Васілю Глінскаму—за 28 зл., А. Дуравічанцы — за 4 зл. 17 гр., грамадзянам вёскі Бліэна, Косаўскага пав.—за 25 зл. 84 гр., в. Долгбы, гм. Сьв.-Воля—за 14 зл. 39 гр., в. Сасноўка, Пружанскага пав.—за 5 зл., в. Асташына, Наваградзкага пав. — 20 зл. 25 гр., в. Баяры таго-ж пав.—4 зл. 35 гр., в. Була, Косаўск. пав. — 6 зл., в. Куляшы, таго ж пав. — 5 зл. 30 гр., вёска Шчыцкае, таго-ж пав.—4 зл. 50 гр., гурткам: Езотаўскаму, Беласт. пав.—1 зл. 80 гр., Катадліцкаму — 10 зл. 40 гр., Пляхоўшчынскаму, Пружанск. пав. — 5 зл., Бусяжскаму, Косаўскага пав. — 7 зл. 1 гр., Баравіцкаму, Наваградзк. пав.—3 зл. 75 гр., грамадзянам Праззроцкае гм. — за 98 зл. 50 гр., і грам. сабраўшым грошы па падпісным лістам: Янку Маслоўскаму пад. ліст № 30/II — 18 зл. 90 гр., Янку Мятле п. л. № 24/I 2 зл. 25 зл., Сьцяпану Мятле п. л. № 21/6—22 зл., Юрку Краську, п. л. № 20—4 зл. 50 гр., Янку Ганебнаму п. л. № 24—2 зл. 50 гр., і Станіславу Ярковіцу п. л. № 34—14 зл. 60 гр.

Управа.

Сьпіс

асоб, ахвяраваўшых на адбудову Гімназіі ў Глыбокім: Шудзель Аляксандар—10 гр., Фомін Зьмітрук—10 гр., Катовіч Тамаш 10 гр., Катовіч Цыпрыян—10 гр., Васюцёнак Захарка—10 гр., Маляўка Юльян — 10 гр., Пецка Янка—10 гр., Маляўка Янка—10 гр., Катовіч Аляксандар—10 гр., Васюцёнак Міхалка—10 гр., Чэркес Янка—10 гр., Бортнік Гарасім — 10 гр.

Збор у Амэрыцы.

У Амэрыцы ахвяры на Глыбоцкую Гімназію зьбірае: Беларускі Нацыянальны Саюз у Чыкаго (скарбнік І. Курдзёнак—1748 Вэст 45 вул. ў Чыкаго) і грам. Андрэй Татарын.

Грамадзкая ахвярнасьць.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Падстарыны, Борка-Гічыцкае гміны, Косаўскага павету складае шчырую падзяку ўсім грамадзянам вёскі Падстарына за ахвяры, зложаныя на бібліатэку-чытальню пры Гуртку Т-ва Беларускае Школы ў в. Падстарына, у суме 48 зл. і 20 гр.

Заява

ў справе ўвядзеньня ў беларускім друку лацінікі.

Мы, ніжэйпадпісаныя грамадзяне м. Міра, Стаўпецкага павету, даведаўшыся аб праектаваньні камісіі да спраў беларускіх школаў пры Віленскім і Наваградзкім кураторыумах увясьці ў нашае беларускае пісьменства лацінікі, аднагалосна пратэстуем супроць такога безгляднага ўмешываньня ў справы нашага пісьма. Мы, праваслаўныя беларусы, з увагі на панаваньне з доўгіх часоў у нашых беларускіх друках гражданкі, да якой прызвычаіліся і нашы дзеці, знайшлі патрэбным бараніцца ад няслушных вымаганьняў ужываньня ў нашым друку незнаёмае нам лацінікі.

Зазначаем, што такі шлях правядзеньня беларускае культуры сярод несьвядомых толькі адсуне нас ад заваёваных многагадовай працай культурных здабычаў агульных веданьняў пісьма.

(Ідуць 35 подпісаў).

Культурна-асьветныя справы на мясцох.

× Дня 16./III. 1927 г. была зроблена рэвізыя ў Скідэльскім Гуртку Т-ва Беларускае Школы і забраны: пячатка круглая і разам усе канцэлярскія паперы, а таксама разгромлена бібліатэка-чытальня, пазабіралі каталёгі і некаторыя кніжкі, як „Гісторыя Беларускае Літэратуры" і інш. і 400 штук дэкларацыяў. Тое, што пры вобыску паліцыя ня брала, то кідала на падлогу і таптала нагамі.

Дзеля гэтага Акружная Управа робіць інтэрвэнцыю ў п. Пракурора і адначасна просіць Галоўную Управу зрабіць загад перад вышэйшай уладай аб найхутчэйшым звароце забраных рэчаў.

× Дня 17./III. 1927 г. зьявілася паліцыя Заблудаўскага пастарунку з камэндантам і зрабілі вобыск. У мяне ў памешканьні забралі сяброўскі білет, інструкцыю, праграму, пасьведчаньне, паведамленьне да Старасты, усё тое, што было прыслана з Т-ва Беларускае Школы.

Прашу паведаміць мяне, ці паліцыя мае права забараніць закладаць Гурткі Таварыства Беларускае Школы. М. Рудноўскі.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.